20. Paris, L. La chronique de Nestor, traduite en français, accompagnée de notes et d'un recueil de pièces inédites touchant les anciennes relations de la Russie avec la France. – T. I / L. Paris. – Paris : Heideloff et campé, 1834. – 450 p.
21. Richard, A. Un diplomate poitevin du XVI siècle: Charles de Danzay, ambassadeur de France en Danemark / A. Richard. – Poitiers : Imprimerie de Blais et Roy, 1910. – 246 p.
22. Rördam, H. F. Résidents français près la cour de Danemark au XVI siècle / H. F. Rördam // Extrait du Bulletin de l'Académie royale des sciences et des lettres du Danemark pour l'année 1897. – Copenhague : Imprimerie de F. Dreyer, 1898. – P. 619–668.

**Клімаў М. В.**

## ГРАВЮРЫ ФАРТЭЦЫЙ ПЕРЫЯДУ ЛІВОНСКАЙ ВАЙНЫ: ВЕРЫФІКАЦЫЯ ПАВОДЛЕ АРХЕАЛАГІЧНЫХ КРЫНІЦ. ПАПЯРЭДНІЯ ЗАЎВАГІ

Лівонская (Інфлянцкая) вайна пакінула пасля сябе не толькі знішчэнне часткі населеных пунктаў і насельніцтва ў паўночнай частцы Беларусі, але таксама спрыяла фарміраванню корпуса ілюстратыўных, картаграфічных крыніц, якія дазволілі павялічыць крыніцазнаўчую базу. Падчас і пасля ваеннай кампаніі з'явіўся шэраг мапаў, якія з рознай доляй дакладнасці адлюстроўвалі тапаграфічныя аб'екты. Акрамя мапаў былі надрукаваны і выявы фартэцый, пабудаваных войскамі Івана IV Жахлівага. Найбольш вядомымі з'яўляюцца гравюры на якіх змешчаны выявы 6 фартэцый: Туроўля, Сокал, Казьян, Сітна, Суша, Красный. Аднак фартэцый было больш. Не існуе выявы Нешчарды, якая згадваецца разам з іншымі фартэцыямі адносна апошняга перыяду вайны [4, с. 52]. Адсутнасць Нешчарды сярод указаных фартэцый звязана з даволі познім штурмам умацавання, напрыканцы 1579 г. [3, с. 137–138]. Таму на гэты час С. Пахалавіцкі, як асноўны стваральнік малюнкаў, паводле якіх пазней рабіліся гравюры, ужо, відаць, пакінуў Полаччыну.

Такім чынам, выявы фартэцый ствараліся непасрэдна падчас "Полацкай кампаніі" у жніўні–верасні 1579 г. Таму акрамя вышэй згаданай Нешчарды адсутнічаюць і выявы такіх умацаванняў як Ушачы, Крэчат, Гомель. Пытанне выклікае лакалізацыя і вонкавы выгляд указаных пунктаў, бо аб іх гаворка ў дакументах вялася да ваенных падзей 1579 г., што ўскосна ўказвае на іх ранейшае знікненне [15, с. 90–91; 16, с. 123][1].

З ліку адлюстраваных на гравюрах, дакладна не вядома месцазнаходжанне фартэцыі Красны (мал. 1: *1*), што, па нашаму меркаванню, звязана з пазнейшымі пераўтварэннямі на мясцовасці[2]. Такім чынам, аб'ектыўна магчыма весці гаворку аб пяці выявах фартэцый у сувязі з пытаннем верыфікацыі паводле археалагічных крыніц. Папярэднія заўвагі, вынесеныя ў назву, адлюстроўваюць стан даследаванасці фартэцый археалагічным шляхам, або розную ступень іх вывучэння. Пры паглыбленні вывучэння праблемы і матэрыялы, прыведзеныя ў прапанаваным артыкуле будуць набываць карэктыроўку.

Звычайна, выявы фартэцый падпісваюцца як гравюры С. Пахалавіцкага – Дж. Кавальеры, аўтараў малюнкаў і гравюр. Існуе дыскусійны момант адносна таго, наколькі ўсе малюнкі фартэцый былі выкананы адным С. Пахалавіцкім ці некалькімі людзьмі[3]. Стылізацыя ж малюнкаў і "гравірызацыя", выкананая ў 1580 г. мае адно аўтарства, што вынікае з агульнай манеры іх выяў.

Калі пакінуць па-за ўвагай шырокае выкарыстанне гравюр як ілюстрацый да падзей Інфлянцкай (Лівонскай) вайны іх асобны разгляд, звычайна, прыводзіў да прамой рэтрансляцыі таго, што было бачна на гравюрах. Большасць з аўтараў, якія згадвалі аб фартэцыях ніколі не наведвалі месцы іх размяшчэння, аднак меркавалі аб выявах фартэцый вельмі ўпэўнена. Такая традыцыя ўмацавалася яшчэ ў XIX ст. Так М. В. Без-Карніловічам без сумнення апісваў такія ўмацаванні зыходзячы з выяў на гравюрах [1, с. 123–124, 127]. З гэтай нагоды дастаткова красамоўна выглядае апісанне фартэцыі Сокал, прапанаванае А. Семянтоўскім, якім адносна фартэцыі, было напісана наступнае: "Замок этот был одним из сильнейших: он имел одинадцать башен и был окружен деревянной стеной, валом и рвом. <u>Следы последних существовали ещё не так давно, а быть может существуют и поныне "</u> [13, с. 56]. У апошняй фразе адлюстраваны якраз праекцыйны падыход праз поўную згоду з пабачаным на гравюры. Да 1917 г. менавіта выявам фартэцый была прысвечана асобная публікацыя, зробленая А. Сапуновым. Аднак А. Сапуновым пераказваліся раней вядомыя факты [12]. У пазнейшых выданнях пераважала некрытычнае стаўленне да адлюстраванага на гравюрах. Выява фартэцыі на гравюры апісвалася згодна з тым, што жадаў пабачыць аўтар даследавання. Найбольш поўна такі падыход быў рэалізаваны ў працы Б. Брэжга [2].

Першая спроба археалагічнага вывучэння фартэцый, выявы якіх пакінулі аўтары XVI ст. належыла маскоўскаму археолагу М. Г. Рабіновічу [11]. Наступным даследчыкам фартэцый выступіў

[1] З улікам адсутнасці іх выяў на гравюрах далей развіваць гэта пытанне ў прадстаўленай публікацыі не карэктна.
[2] Пры пошуку фартэцыі аўтарам узнікла версія аб тым, што пры будаўніцтве гравійнай дарогі паміж азёрамі магчымыя рэшткі фартэцыі былі знішчаны.
[3] Гэта пытанне вынесена на рамкі прадстаўленага артыкула



Рэпазіторый БрДУ

М. А. Ткачоў [14][1]. З часу абследавання, праведзенага М. А. Ткачовым шэраг археолагаў былі на месцы фартэцый без правядзення на іх археалагічных прац. Аўтарам артыкула археалагічныя працы і абследаванні на тэрыторыі вышэй указаных фартэцый пачалі ажыццяўляцца з 2016 г. У выніку былі атрыманы матэрыялы, якія дазволілі нам сфарміраваць не толькі новае меркаванне аб фартэцыях, але і ўнесці пэўныя карэктывы ва ўспрыманне вышэй указаных ілюстратыўных крыніц, што дазволіць надалей пазбягаць некарэктнага іх апісання.

**Сокал.** Гісторыя лакалізацыі фартэцыі Сокал, змешчанай каля в. Кульнёва Полацкага раёна падкрэслівае сітуацыю з верыфікацыяй ілюстратыўных крыніц збоку археалогіі. Да 2016г. у пытанні месцазнаходжання ўмацавання цалкам пераважала меркаванне аб яго будаўніцтве ў сутоцы рэк Дрысы і Нішчы, што нібы вынікала з выявы гравюры (мал. 1: *2*). Такая выснова падмацоўвалася наяўнасцю прыроднай грады, змешчанай у месцы сутокі, у якой бачылася або прыроднае ўмацаванне, або штучна насыпаны вал. Так у 2015 г. група расійскіх гісторыкаў, у лік якіх уваходзілі А. І. Філюшкін, А. Н. Лобін, А. В. Кузьмін і інш. абследавалі фартэцыі з мэтай суаднясення выяў гравюр на мясцовасці. У выпадку з Сокалам імі без сумнення бачылася фартэцыя ў сутоцы рэк Дрыса і Нішча, а прыродная града была прынята за ўнутраны вал [10]. Гэта бачанне сітуацыі атрымала далейшае развіццё ў адной з сумесных манаграфій, дзе непасрэдна А. І. Філюшкіным было падкрэслена наступнае: "Возможно вал в Соколе играл ту же роль, что в Ивангороде, каменная стена закрывавшая город от обстрела с "Длинного Германа" Нарвского замка" [15, с. 80–81]. Як паказалі абследаванні аўтара, так званы, "вал" з'яўляўся прыроднай градой, на якой у свой час размяшчалася гарадзішча І тыс. н. э. з пластом, што ўтрымліваў ляпную кераміку [5, с. 24–25].

З 2016 г. аўтару артыкула ўдалося дакладна лакалізаваць месцазнаходжанне Сокала і змяніць гістарыяграфічную памылку. Фартэцыя знаходзілася за 350–400 м ад сутокі рэк Дрысы і Нішчы, каля левага берага апошняй са згаданых рэк [8, с. 191–192]. Даследаванні на месцы фартэцыі праводзіліся з 2016 па 2020 г. і дазволілі зрабіць пэўныя высновы адносна яе выявы на гравюры.

Па-першае, асобныя элементы, змешчаныя на гравюры гіпертрафіраваны і стылізаваны. Найперш гэта датычыцца такіх элементаў як: узвышаныя пляцоўкі пад вежамі; пратока да р. Дрысы (мал. 1: *2, а*). На мясцовасці існаванне такой вялікай пратокі, злучанай з р. Дрысай не магчыма з-за перапада высот паміж лакалізаваным месцам фартэцыі Сокал і долам каля р. Дрысы. Гэты перапад складае каля 8 м і такім чынам злучыць фартэцыю з р. Дрысай было не магчыма і не мэтазгодна. У выпадку калі фартэцыя не была дакладна лакалізавана і яе месцазнаходжанне звязвалася непасрэдна з сутокай рэк Дрысы і Нішчы такое пытанне нават не ўзнікала. У той час што мы маем насамрэч? Дакладна існуе штучны вадаём у межах фартэцыі і невялікая пратока-ручай, якая спускаецца з гэтага вадаёма долу для адводу лішняй вады. На дне вадаёма фіксуюцца камяні.

Па-другое, люстэркавае адлюстраванне забудовы. Па археалагічных данных там дзе на гравюры паказана шчыльная забудова, яна часткова адсутнічала. А там дзе яе няма на гравюры, яна фіксавалася па археалагічных данных. Гэта пытанне застаецца адкрытым, тым больш што ўсходні, напольны бок фартэцыі ў месцы знаходжання абарончага рва і месцаў пляцовак вежаў не меў слядоў агню.

Па-трэцяе, адсутнасць асобных элементаў, існаванне якіх даказваецца з боку пісьмовых і археалагічных крыніц, а менавіта, наяўнасць прахода і брамы збоку р. Нішчы і маста праз гэту рэку. У 2019 г. быў лакалізаваны ўладкаваны да 1579 г. праход да р. Нішчы, выяўлены сляды пажару і асобныя элементы зброі. Пакуль сляды брамы не былі знойдзены, але яе існаванне не выклікае сумненняў.

Што датычыцца дакладнасці самога малюнка, то трэба падкрэсліць, што нягледзячы на пэўныя праўкі і стылізацыю не выклікае сумненняў і той факт, што план фартэцыі складаўся на месцы, падчас ваенных падзей 1579 г. на што ўказвае не толькі лінія рэчышча р. Нішчы, а таксама і дакладная лакалізацыя брамы, адлюстраваная на месцы фартэцыі (мал. 1: *2, б*). Пры супастаўленні гравюры з мясцовасцю ўдалося вызначыць месцазнаходжанне брамы і цалкам яе даследаваць. Паказальна, што агульны план брамы ў выглядзе прамакутніка, а не ў выглядзе аб'ёмнай вежы цалкам быў даказаны археалагічна [6, с. 15, мал. 19; 9, с. 39, мал. 5: *Б*].

Да гэтага часу не атрымалася лакалізаваць усе вежы, змешчаныя на гравюры, што звязана з адсутнасцю валоў і пастаментаў для веж. Адносна толькі трох вежаў, упісаных у лінію абароны рва з напольнага боку магчыма весці гаворку аб дакладнай лакалізацыі (мал. 1: *2, в*). Адна з вежаў змяшчалася на невялікай круглай пляцоўцы пасярод рва, дзве іншых – выступалі перад рвом і фланкіравалі яго. Спробы лакалізацыі кутняй вежы, змешчанай у паўночна-заходнім куце фартэцыі (мал. 1: *2, г*) яшчэ раз падцвердзілі адсутнасць пастаментаў пад вежамі.

[1] Асобныя вынікі абследаванняў указаных даследчыкаў будуць прыведзены ніжэй, адносна кожнай з разгледжаных фартэцый.



Репозиторий ВГУ




*1*




*2*




*3*




*4*




*5*




*6*

**Мал. 1. Выявы фартэцый на гравюрах С. Пахалавіцкага – Дж. Кавальеры.**

Рэпазіторый ВДУ

Схематычна блізка да рэальнасці быў паказаны роў (мал. 1: *2, д*), які з паўночнага і паўночна-усходняга боку абараняў фартэцыю. Рэшткі гэтага рва назіраюцца і зараз, часткова былі закапаны.

Такім чынам адносна фартэцыі Сокал магчыма казаць аб правільным паказе фартэцыі ў агульных рысах.

Іншае ўмацаванне, адносна якога былі праведзены археалагічныя працы ў 2014–2015 гг. з’яўлялася фартэцыя **Туроўля** (мал. 1: *3*), змешчаная ў сутоцы рэк Тураўлянка і Заходняя Дзвіна ў межах сучаснай вёскі Гарадзішча Полацкага раёна. Паказальна, што на Радзвілаўскай мапе 1613 г. Туроўля адзіная з пяці лакалізаваных фартэцый, адноснае месцазнаходжанне якой было паказана памылкова – па леваму, а не па праваму (на гравюры) берагу р. Тураўлянкі. Пры супастаўленні выявы Туроўлі з сітуацыяй на мясцовасці было засведчана, што “вадаём” з напольнага боку не захаваўся (мал. 1: *3, а*), сляды вежаў і валоў адсутнічаюць. Выклікае пытанне адносна супастаўлення гравюры з рэальна існуючымі ўмацаваннямі толькі ўчастак былых акопаў уздоўж левага берага р. Зах. Дзвіны. Нельга выключаць, што акопамі часткова былі знівеліраваны рэшткі вала ўздоўж берага. Разам з тым, археалагічнае даследаванне за 84 м на захад ад левага берага р. Зах. Дзвіны дазволіла зафіксаваць выразны культурны пласт, звязаны з жыццядзейнасцю і ваеннымі падзеямі. Тут былі выяўлены прыкметы пражывання ў межах паселішча прадстаўнікоў стралецкага войска, а менавіта: канцэнтрацыя абутковых падковак з шыпамі, спражак, конскай вупражы і асобных узораў зброі (піка, фрагменты баявых нажоў, наканечнікі стрэл). У якасці прамога сведчання ваенных падзей выступала канцэнтрацыя свінцовых куль як у межах даследаванай плошчы так і вакол раскопаў. З улікам таго, што Туроўля не была ўзята ў выніку штурма, (да жніўня 1579 г. былі адбіты спробы яе захапіць з боку войск пад камандаваннем Ф. Жука), было зроблена заключэнне аб наяўнасці “стралецкай слабады”, змешчанай побач з фартэцыяй, аднак не адлюстраванай на гравюры [7, с. 36–38].

Такім чынам, параўноўваючы выяву фартэцыі на гравюры з рэальна існуючай сітуацыяй магчыма казаць аб пэўных зменах мясцовасці і адсутнасці відавочных сведчанняў наяўнасці пастаментаў пад вежамі і валоў па ўсяму перыметру.

**Сітна**. Месцазнаходжанне фартэцыі Сітна звязваецца з месцам вытокі р. Палаты з возера Ізмок каля в. Малое Сітна Полацкага раёна (мал. 1: *4*). Першыя абмежаваныя археалагічныя доследы былі праведзены яшчэ ў 1969 г. М. А. Ткачовым. Па выніках шурфовачных прац даследчык прыйшоў да высновы аб тым, што забалочанае месца было выслана дубовымі падкладкамі каб падняць пляцоўку для ўсталявання фартэцыі [14]. У выніку абследавання, праведзенага аўтарам артыкула магчыма казаць аб тым, што характэрныя асаблівасці мясцовасці на гравюры перададзены адносна дакладна, сярод іх: берагавая лінія, ручаіна з мастком (мал. 1: *4, а*). Побач з узвышанай часткай былі праведзены шурфовачныя працы і быў зафіксаваны культурны пласт і сляды пажара [6, с. 41]. Аднак іншыя элементы, якія ўмацоўвалі пляцоўку, апісаныя А. М. Ткачовым не былі прасочаны. Зрабім дапушчэнне аб тым, што ўзвышаная частка магчыма мела ўзмоцненую падсыпку каб узняць больш умацаваную частку фартэцыі на мясцовасці. На гравюры выкарастана традыцыйная схема стылізацыі з наяўнасцю 4-х вежаў і сцен, аднак на мясцовасці пляцоўкі вежаў ніякім чынам не абазначаюцца. След невялікага вала, вышынёй не болей за 0, 8 м магчыма назіраць толькі з напольнага, паўночна-заходняга боку ад узвышанай часткі фартэцыі. Рвы адсутнічалі. Магчыма, што ручаіна з напольнага боку, паказаная на гравюры, якая існуе зараз, была ўтворана штучна і выконвала функцыю воднай перашкоды.

Месца з правага боку ад мастка таксама характарызуецца наяўнасцю асобных фрагментаў ганчарнай керамікі, дзе на гравюры паказаны хаты (мал. 1: *4, б*) што можа ўказваць на наяўнасць паселішча – “стралецкай слабады”.

Фартэцыя **Казьян** лакалізавалася каля сучаснай в. Красамай Шумілінскага р-на ў выгіне правага берага р. Обаль (мал. 1: *5*), якая ў гэтым месцы некалькі разоў змяняла агульны накірунак рэчышча. Зараз фартэцыя з трох бакоў абкружана правым берагам р. Обаль. На гравюры бачна тая ж асаблівасць размяшчэння ўмацавання трохкутнай форму з трыма вежамі. Даказаць такую структуру фартэцыі па-сутнасці не магчыма. Пры сучасным абследаванні пляцоўкі вежаў не прасочваюцца. Магчыма дапусціць існаванне невялікага рва з напольнага боку (мал. 1: *5, а*) і рэшткаў валоў, якія не вызначаліся істотнай велічынёй.

Фартэцыя **Суша** існавала на паўвыспе, як сведчыць і гравюра (мал. 1: *6*). Зараз паўвыспа, абмежавана двума азёрамі, з поўначы – возерам Цемяніца, з поўдня – возерам Астраўкі. Адносна фіксацыі пляцовак веж і валоў неабходна ўказаць на тое, што працы былі пачаты яшчэ М. Г. Рабіновічам. У 1948 г. М. Г. Рабіновічам фіксаваліся рэшткі вала і зроблена шурфоўка, якая была безвыніковай [11, с. 83–84, рыс. 38]. Рэшткі валоў таксама назіраліся і М. А. Ткачовым [14]. На гравюры абаронча патэнцыял фартэцыі складаўся з 6 вежаў і вежы-брамы, злучаных сцяной. З улікам таго, што фартэцыя была абаронена вадой аб наяўнасці рвоў магчыма казаць толькі

Репозиторий ВГУ

адносна перашыйка з заходняга боку (мал. 1: *6, а*), аднак пры наяўнасці пратокі (заходні бок) і пазнейшай гаспадарчай дзейнасці іх сляды ідэнтыфікаваць было не магчыма. У выніку абследаванняў аўтарам артыкула ў 2019 г. рэшткі земляных умацаванняў праглядаліся з паўночна-заходняга, паўднёва-заходняга і паўднёва-усходняга боку замчышча. Лакалізацыя ж М. Г. Рабіновічам пляцоўкі вежы, памерамі 19 х 40 м магчыма прызнаць памылковай. Структура паўвыспы не супадае з агульнай выявай на гравюры, бо рэальна асобна выдаецца на мясцовасці паўночны ўзвышаны выступ паўвыспы, паміж якім і асноўнай пляцоўкай выспы захоўваецца паніжаная, заводненая частка ў выглядзе невялікага перашыйка, які мог быць створаны падчас Інфлянцкай вайны. Аднак на гравюры гэта асаблівасць адсутнічае (мал. 1: *6, б*).

Такім чынам, праведзеная верыфікацыя выяў гравюр фартэцый з данымі археалагічнага абследавання і раскопак дазволіла ўдакладніць інфармацыю, якую ўтрымлівалі ілюстратыўныя крыніцы. Найбольшая колькасць удакладненняў была засведчана адносна фартэцыі Сокал, што з'явілася вынікам шматгадовых раскопак. Пры абмежаваных археалагічных працах удакладненні насілі мінімальны характар. Найбольш выразнай дэталлю усіх выяў гравюр, якая не супадала з рэальным станам з'яўляўся паказ фартэцый з "мураванымі сценамі" і вежамі, якія мелі ўзвышаныя пляцоўкі, што ў рэальнай сітуацыі не прасочвалася. Усе ўмацаванні былі драўлянымі. Пісьмовыя крыніцы і археалагічныя працы ў шэрагу выпадкаў сведчаць і аб наяўнасці двух брам (Сокал, Туроўля), аднак на гравюрах іх выявы адсутнічалі. Не выклікае сумненняў, што малюнкі, створаныя С. Пахалавіцкім былі зроблены на месцы размяшчэння кожнай з фартэцый падчас ваенных падзей 1579 г.


1. Без-Корнилович, М. О. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии с привосокуплении и других сведений к ней же относящихся / М. О. Без-Корнилович. – СПб, 1855. – 355 с.
2. Брэжго, Б. Замкі Віцебшчыны / Б. Брэжго. – Вільня, 1933. – 38 с.
3. Вінаходаў, Дз. Як Няшчэрда стала легендай. Гістарычная аснова падання пра волата Княжу ў кнізе "Шляхціч Завальня" Яна Баршчэўскага / Дз. Вінаходаў // ARCHE. – 2011. – № 5. – С. 128–143.
4. Гейденштейн, Р. Записки о Московской войне (1578–1582). / Р. Гейденштейн. – СПб. : Изд-во мин. внутренних дел, 1889. – 309 с.
5. Клімаў, М. В. Фартэцыя Туроўля: новыя звесткі паводле археалагічных доследаў [Электронны рэсурс] / М. В. Клімаў // Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў : электрон. зб. навук. арт. IV міжнар. навук. канф. Да 50-годдзя Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта, Полацк, 19–20 красавіка 2018 г. // Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт ; пад агул. рэд. А. І. Корсак. – Наваполацк, 2018. – 1 электрон апт. Дыск (CD-ROM). – С. 30–39.
6. Цэнтральны навучны архіў Нацыянальнай акадэміі навук (ЦНА НАН) Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 3447.
7. ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 3491а – тэкст; № 3491б – альбом.
8. Клімаў, М. В. Вызначэнне дакладнага месцазнаходжання фартэцыі Сокал па выніках археалагічных прац 2016 г. / М. В. Клімаў // МАБ. – 2019. – № 30. – С. 191–206.
9. Клімаў, М. В. Фартэцыі перыяду Інфлянцкай вайны на тэрыторыі Расоншчыны па выніках новых археалагічных даследаванняў (2016–2017 гг.) / М. В. Клімаў // Беларусь праз прызму рэгіянальнай гісторыі: Расонскі край. Гісторыя, культура, людзі (да 100-годдзя з дня нараджэння П. М. Машэрава) : зб. навук. арт. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т гісторыі ; навук. рэд. М. В. Клімаў ; рэдкал. : В. В. Даніловіч [і інш.]. – Мінск : Беларуская навука, 2020. – С. 28–43.
10. Полоцкая земля как контактная зона при Иване Грозном, 1563–1579 гг., экспедиция 18–25 июля 2015 г. – Режим доступа: https://history.spbu.ru/nauka/nauchnye-tsentry/285-rgnf-pogranichie-2015/ekspeditsii/910-polotskaya-zemlya-kak-kontaktnaya-zona-pri-ivane-groznom-1563-1579-gg-ekspeditsiya-18-25-iyulya-2015-g.html. – Дата доступа: 25.03.2021.
11. Рабинович, М. Г. Археологическая разведка в Полоцкой земле / М. Г. Рабинович // Краткие сообщ. о докл. и полевых исслед. Ин-та истории материальной культуры Акад. наук ССС Р. М., 1950. – Вып. 33. – С. 81–88.
12. Сапунов, А. П. Рисунки крепостей, построенных по повелению царя Ивана Грозного после завоевания Полоцка в 1563 году. С 6-ю рисунками / А. П. Сапунов // Полоцко-Витебская старина. – 1912 – Вып. 2. – С. 299–313.
13. Сементовский, А. М. Белорусские древности. / А. М. Сементовский. – Вып. 1. – СПб, 1890. – 136 с.
14. ЦНА НАН Беларусі. – ФАНД. Воп. 1. Арх. № 444.
15. Филюшкин, А. И. Когда Полоцк был российским. Полоцкая компания Ивана Грозного 1563–1579 гг. / А. И. Филюшкин, А. В. Кузьмин. – М., 2017.
16. Янушкевіч, А. Вялікае княства Літоўскае і Інфлянцкая вайна 1558–1570 г. / А. Янушкевіч. – Мінск : Медысонт, 2007. – 356 с.


Репозиторий ВГУ